Беларускі Звон

Радыкальная тыднёвая часопіс

Цана асобнага нумару **20 гр.**

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
Вільня, Ліпоўка 18.

Прыймо інтэрэсантаў
ад 10 да 2 гадз. што-дня,
апрача сьвятаў і нядзель.

Падпіска з дастаўкай да хаты:
на 1 год—6 зл., за паўгоду—3 зл., за 3 мес. — 2 зл., за 1 мес.—50 гр.

Год I. | Вільня, 6 студзеня 1931 г. | №. 1

Прычыны крызісу.

Беларуская справа перажывае цяпер цяжкі крызіс. Гэта ведама ўсім, і ўсе шукаюць прычын яго, каб пасьля лягчэй было знайсьці спосаб змаганьня з ім. І мы, распачынаючы нашае выдавецтва, пачнем з спробы выяўленьня—калі ня ўсіх зразу, дык прынамся галоўных прычын нашага нацыянальнага крызісу.

Прычыны гэтыя — перад усім вонкавыя, вынікаючыя з таго, што народ беларускі ня мае сваей дзяржавы, а падзелены паміж некалькімі суседнімі дзяржавамі, у каторых прадстаўляе гэтак-званую „нацыянальную меншасьць", хоць на сваей зямлі складае большасьць. Гэтак беларусы перажываюць тую-ж самую трагэдыю, якую каля паўтараста гадоў перажывалі й палякі. І тыя дзяржавы, да якіх належаць беларускія землі (—за выняткам мо' аднае Латвіі), вядуць акцыю дэнацыяналізаваньня беларусаў, далучаньня іх да "пануючай" нацыянальнасцьі, каб сокамі нашага народу ўзмацняць „пануючую" нацыю.

Паўтарастагадовая гісторыя нявол польскага народу паказала аднак, што ніводзін з яе валадароў, хоць і вышэй за не стаяў культурна, ня здолеў „ператравіць" польскага элемэнту, зьнішчожыць нацыянальныя асаблівасьці палякоў. Вонкавы націск заўсёды аказваўся бяссільным супроць сьвядомага адпору польскіх масаў.

Такі-ж абраз прадстаўляе сягоньня народ беларускі. Але народы, якія над намі пануюць, не абмежываюцца вонкавым дзеяньнем: яны стараюцца разбурываць нацыянальнае жыцьцё, нішчыць нашу грамадзкую арганізацыю—*беларускімі рукамі.* І, як гэта ня сумна, а заўсёды знаходзяцца сярод нас людзі, гатовыя выпаўняць такую ганебную ролю.

Беларуская прэса радыкальнага кірунку ўжо ня раз парушала справу гэтак-званых „палітычных орыентацый". Розныя беларускія групкі, пачуваючы ўласную слабасьць, стараюцца абаперціся на дапамозе дужых саюзьнікаў і — за гэту дапамогу — няўзнак пачынаюць служыць не сваей, беларускай справе, а — справе гэных саюзьнікаў. Ня будзем тут затрымлівацца на старых хваравых праявах ці то „полёнофільства" тыпу Аляксюкоўшчыны і Павлюкевічаўшчыны, ці то „літвінофільства„ беларускіх клерыкалаў: гэта рэчы ведамыя ўсім. Зьвернем цяпер увагу на іншую орыентацыю — орыентацыю на... Комінтэрн.

На першы пагляд магло-б здавацца, што орыентацыя на нейкую *міжнародавую* арганізацыю, якой формальна зьяўляецца Комінтэрн, для беларусаў нічым небясьпечным пагражаць ня можа. На-жаль, Комінтэрн у адносінах да беларусаў праводзіць не міжнародавую, а *маскоўскую* палітыку, якая, як і за царскіх часоў, імкнецца „славянскія ручаі зьліць у расейскім моры", інакш кажучы — абмасковіць і беларусаў, і украінцаў ды гэтак забясьпечыць Маскву ад аддзяленьня ад яе Беларусі ды Украіны. І вось тыя беларускія дзеячы ці навет цэлыя грамадзкія групы, якія з добрай верай гатовы былі падпарадкавацца *міжнародавай* рэвалюцыйнай палітыцы, аказаліся зусім неўспадзеўкі на ўслугах *маскоўскае нацыяналістычнае палітыкі.* І вось на нашых вачох Масква іхнімі рукамі пачала самым жорсткім спосабам біць — беларусаў.

Пэўна памятны ўсім тыя чорныя ў нашым жыцьці пад Польшчай дні, калі прадстаўнікі гэтага кірунку, „па пяць замкоў" вешалі на беларускіх гімназіях, „узрывалі" беларускія ўстановы і арганізацыі ды гразёй аблівалі ўсіх, хто даваў ім адпор. Але цяпер маскоўскія „чырвоныя нацыяналісты" гэтым не здаволіваюцца: ім трэба фізычна вынішчыць беларускую інтэлігенцыю ў БССР — тую інтэлігенцыю, якая ў працягу апошніх дзесяцёх гадоў з напружаньнем усіх сваіх сілаў тварыла падставы беларускае культуры. І вось „чырвоная" Масква вызначыла на кату для гэтай інтэлігенцыі — нашых-жа беларусаў.

Знайшла яна іх — тут, у нас, у Заходняй Беларусі, а прыгатавала іх для Масквы—няўдалая палітыка польскага ўраду.

Мы гаворым тут аб былых павадыроў Беларускае Сялянска-Работніцкае Грамады, якія у другой інстанцыі дасталі па 6 гадоў катаржнае турмы, але праседзіўшы палову гэтага часу, аказаліся звольненымі з вастрогу. Толькі звальненьне гэтае было нейкае дзіўнае: хоць яны і выйшлі з вастрожных муроў, але правоў ім не вярнулі, дык і палажэньне іх сталася ў Польшчы нязвычайна цяжкім. І вось чацьвёра з іх — Тарашкевіч, Рак-Міхайлоўскі, Мятла і Бурсэвіч—пакінулі межы Польшчы. Першы з іх — паводле чутак — жыве ў Гданску ці Бэрліне; трое другіх — паехалі ў Менск. А там — апынуўшыся на ласцы Савецкае ўлады — дакаціліся да таго, што, як падаем ніжэй за савецкай прэсай, на мітынгах выступаюць проці арыштаваных у Менску беларускіх дзеячоў (справакаваных, здаецца, агентамі Г. П. У.!) і трэбуюць для іх — *кары сьмерці...* А іменем Тарашкевіча — ня ведаем ці то з яго згоды, ці хутчэй усяго зусім яго ня пытаючы— Камуністычная Партыя Зах. Беларусі падпісывае адозвы і лістоўкі, якімі маніцца *забіць ужо ня фізычна, а маральна і палітычна* ўсіх тых беларускіх працаўнікоў, якія яшчэ не зложылі аружжа, а ўсімі сіламі — творчай працай — *змагаюцца за беларускасьць на сваіх землях пад Польшчай.*

І мала гэтага: „чацьвёрка" былых грамадаўскіх павадыроў, выкарыстаўшы гэтае сваё звальненьне з вастрогу і ўцёкшы за граніцу, *засудзіла на адбыцьцё вастрожнае кары да канца каля паўтары сотні „менш важных" грамадаўцаў*, якім такое „ласкі" польская дзяржаўная ўлада не зрабіла і — пасьля паступку Тарашкевіча і Компаніі — пэўна ўжо ня зробіць. І гэту шэрую грамадаўскую масу будуць далей трымаць за кратамі — пад той час, як паны Тарашкевіч і Комп. дапамагаюць „чырвонай" Маскве расправіцца з барацьбітамі за беларускую справу і ў Савецкай Беларусі і ў Заходняй.

Удумайцеся, грамадзяне, у страшную трагічнасьць таго, што ў нас робіцца. Разважце, якім шляхам Тарашкевіч і яго аднадумцы дакаціліся да сваей сягоньняшняй ролі, — і вы зразумееце, што мы маем ізноў дзела з фальшывай панятай орыентацыяй, што ізноў людзі забыліся, што *орыентацыі на тую ці іншую чужую сілу мусяць мець на мэце карысьць беларускага народу, а ня гэтай чужой сілы.* І тады зробіце вывад, да якога дайшлі і мы: каб выйсьці з сучаснага крызісу, трэба крэпка верыць у творчыя сілы беларускага народу, трэба гэтыя сілы ў ім будзіць і разьвіваць, трэба ў гэтай сьвядомасьці ўзгадаваць і нашу моладзь, і нашы працоўныя масы, — і тады замест усіх цяперашніх орыентацыяў на чужынцаў народ наш будзе мець *адну толькі орыентацыю — на самога сябе.* А яна ня дасьць ужо нам зьбіцца на фальшывы шлях.

* * *

**Калі ў час маўклівай адзіноты
Ляту я думамі ўпярод, ў далячыню —
Там бачу дар за сёньняшні турботы:
Канец няўдзячнаму, нямілому жыцьцю.
Там, там далей на сонечныя прасторы,
Сярод цьвітучых ніў і творчае красы
Міняцца постацьцю ў казачным уборы
Надзеяў сёньняшніх прыгожыя часы.—
Там, там няма нязгоды і даганаў,
Ня льлецца кроў, ня чутны дужых шал, —
Там — у сям'і свабодных грамадзянаў —
Пануе скрозь і ўсьцяж сужыцьця ідэал. —
Там, там усе грамадзкія парывы
Складаюць творчы высілак адзін,
Які змагае крыўды і сумлівы,
Даючы роўны ход між гораў і далін.
— — — — — — — — — — — — — —
Ляту туды ў мамэнты лятуценьня,
Ляту, каб там думаю адпачыць,
Пазбыцца хоць на міг жыцьцёвага цярпеньня
Я сілу там бяру, натхненьне, прагу жыць.**

В. Шкодзіч.

Хворае сумленьне.

Польская прэса ўсіх кірункаў надрукавала зьмест інтэрпэляцыі опозыцыйных паслоў у справе зьдзекаў над арыштаванымі былымі пасламі ў ваенным вастрозе ў Берасьці. Як заяўляюць аўтары інтэрпэляцыі, вязьняў білі, мучылі маральна, удаючы, што маюць іх зараз расстраляць, і гэтак далей.

Опозыцыйная прэса вельмі востра нападае на тых, хто зьяўляецца ці то фактычным, ці маральным вінавайцам берасьцейскіх падзеяў. Адначасна польскія прафэсары вышэйшых навучальных установаў і адвакаты публікуюць свае пратэсты проці таго, што — згодна з інтэрпэляцыяй — тварылася ў Берасьці.

Мы ня будзем тутака займацца пытаньнем аб тым, ці ўсё, зьмешчанае ў інтэрпэляцыі, згодна з праўдай, ці не. Для нас у гэты мамэнт мае значэньне факт грамадзкіх выступленьняў, якія сьцьвярджаюць, што берасьцейскія падзеі ўзварушылі ўрэшце хворае сумленьне польскага грамадзянства.

Мы падчырківаем гэтыя словы: хворае сумленьне, бо яно запраўды такім ёсьць. Мы памятаем, што ў часы да „майвага перавароту" на беларускіх землях тварыліся рэчы, ад якіх запраўды кроў у жылах застывала. У працягу часу ад 1922 да 1925 году Беларускі Пасольскі Клюб злажыў у Сойме не адну, а сотні інтэрпэляцыяў, мала чым розьніўшыхся ад цяперашняе „берасьцейскае". Інтэрпэляцыі гэтыя былі пасьля надрукаваны заграніцай у грубым томе і служылі вялікую службу проціпольскай прапагандзе: пададзеныя ў іх факты білі балюча па сумленьні кожнага чэснага чалавека. І толькі ў польскім грамадзянстве яны не знаходзілі амаль-што ніякага водгуку: усе жудасьці, апісаныя ў іх, датычаліся не палякоў, а — беларусаў... Дык і сумленьне аграмаднае большасьці польскага грамадзянства было зусім спакойнае: якое яму было дзела да нейкае там „беларускае меншасьці", засуджанае яшчэ прэм'ерам Скульскім на вынішчэньне ў працягу 50-цёх гадоў?! — Але іменна гэтае маўчаньне тады польскага грамадзянства— ці-ж гэта не найлепшы доказ, што сумленьне яго было нездаровае?

Мімаволі ўспамінаюцца старыя даваенныя часы, калі ў царскай Расеі дзеяліся кашмарныя рэчы. Але якое-ж абурэньне ахапіла ўсё расейскае грамадзянства, калі казакі нагайкамі разганялі студэнцкія дэманстрацыі, калі цар Мікалай Крывавы расстрэліваў перад Зімовым Палацам стотысячны натоўп мірных маніфэстантаў, з партрэтам царскім і харугвямі царкоўнымі ішоўшых да „Батюшки-Царя" прасіць нейкіх свабод; або калі жандарскі афіцэр згвалтаваў арыштаваную тэрорыстку—забойцу вышэйшага ўрадоўца! Колькі было мітынгаў пратэсту, колькі гарачых рэзалюцыяў! А вось факт з больш блізкіх часоў — з

часоў вялікае вайны. Расейскія войскі занялі Галічыну. І вось пачаліся дзікія расправы з украінцамі, галоўным чынам—з уніяцкімі папамі, якім вырывалі бароды і рабілі яшчэ горшыя рэчы. І вось, каб праверыць жудасныя весткі з Галічыны едзе туды з Масквы ведамы першадумец — „выбаржэц" Віктар Пятровіч Обнінскій, адна з найсьвятлейшых адзінак спасярод расейскага грамадзянства, з якою аўтару гэтае стацьці даводзілася калі-некалі сустракацца. Обнінскій быў гарачым патрыотам, шчыра верыў у неабходнасьць „вайны да пабеднага канца", у высокую „цывілізацыйную місію" дзяржаў Антанты. І вось ён свамі вачыма угледзіў, як выглядала на дзеле — у Галічыне— гэная „цывілізацыйная місія"... Угледзіў, вярнуўся ў Маскву і...налажыў на сябе рукі. Ягонае сумленьне не магло перанясьці таго, што ягоная Айчына рабіла з далёкім яму, няведамым насяленьнем чужое — варожае да Расеі—дзяржавы... А ці чулі мы цяпер падобны голас шчырае крытыкі ў сувязі з падзеямі, што мелі месца ў тэйжа Галічыне падчас апошняе „пацыфікацыі" яе?

Так, сумленьне польскага грамадзянства (ведама, апрача адзінак!) запраўды-ж было і ёсьць хворае, калі яно ўмее рэагаваць толькі на той бізун, які б'ець беспасярэдня па яго скуры. Дый больш таго: мы гэтымі днямі чыталі ў абшарніцкім органе „Слово" дакоры галоўнага рэдактара газэты — прафэсару Зьдзехоўскаму, які далучыў свой подпіс да пратэсту кракаўскіх прафэсароў... Пан Cat (як гэта чытаць: Цат ці Кат?—ня ведаю) абураецца і на тое, што аб берасьцейскіх падзеях загутарылі перш, чым компэтэнтны і бесстаронны суд праверыў праўдзівасьць інфармацыяў, зьмешчаных у пасольскай інтэрпэляцыі. І гэта робіць той самы пан Цат ці Кат, каторы пазваляў сабе агідна бесьціць і абліваць гразёю грамадаўскіх дзеячоў — назаўтра-ж пасьля арыштаваньня іх, ня толькі не чакаючы на выяўленьне праўды на судзе, але падгатаўляючы гэтак спакойнае прыняцьце грамадзянствам нязвычайна жорсткага прысуду першае інстанцыі... А ведама-ж, што галоўны выдавец „Слова" і беспасярэдні шэф пана Цата ці Ката, пан Мэйштовіч, быў якраз ў той час... міністрам справядлівасьці!

Вось як глыбака зайшла ў польскі грамадзкі арганізм цяжкая хвароба сумленьня: тады як, прынамся, сумленьне адзінак рэагуе на рэчы, якія, калі яны праўдзівыя, зьяўляюцца запраўды страшнымі, дык павадыры цэлае клясы — клясы абшарнікаў, якія так сышацца перад „беларускімі хамамі" сваёй „высокай культурай", асуджаюць і гэты рэдкі водрух, які сыгналізуе як-быццам першы праблеск грамадзкага аздараўленьня.

Няма дзяржавы без пачуцця ў грамадзянстве права і законнасьці. Няма грамадзянства ў сучасным разуменьні гэтага слова, калі яно мае хворае сумленьне. Ёсьць толькі — свайго роду акцыйная таварыства сільных дзеля эксплёатацыі слабых. І пакуль у Польшчы польскае грамадзянства будзе аставацца ў гэтакім стане, трудна мець надзею, каб „меншасьцёвыя" грамадзянствы маглі стварыць з ім згоднае сужыцьцё.

Хацелася б верыць, што стан гэты ўрэшце скончыцца. Бо хворых пачаў аздараўляць—бізун.

К. Фалькевіч.

Палітычнае жыцьцё.

Польшча.

Справа польскіх выбараў у „трыбунале" Лігі Нацыяў.

Як ведама, нямецкі ўрад унёс у праграму сэсіі Рады Лігі Нацыяў, што мае распачацца 19 студня, рад скаргаў на польскі ўрад — у сьвязку з адбыўшыміся нядаўна выбарамі ў парлямэнты— краёвы-шлёнскі і агульна-дзяржаўны.

Нямецкі ўрад вінаваціць польскі ў тасаваньні выбарных гвалтаў, у выніку якіх нямецкія выбаршчыкі ў Верхняй Сілезіі страцілі некалькі дзесяткоў тысяч галасоў і адпаведную лічбу мандатаў.

Ліга мае высьветліць ход выбараў у Польскай Сілезіі, а тым самым — у пэўнай меры—і ў Польшчы наагул. Дык, і польскі ўрад, і ўрадавы блёк і ўсе партыі ў Польшчы страшэнна цікавяцца гэтым „працэсам аб польскіх выбарах у трыбунале Лігі Нацыяў. Цяжкое толькі палажэньне польскай апазіцыі. Бо-ж у сябе дома апазыцыя — як правая (эндэцыя), так і „цэнтралевая", — цьвердзіць, што выбары адбыліся з нячуванымі яшчэ ніколі ў Польшчы гвалтамі. Але — з другога боку — тая-ж апазыцыя, асабліва эндэцыя, змушана патрыятычна крычаць, што — пры выбарных гвалтах ува ўсей Польшчы нават проці польскіх партыяў і іншых меншасьцяў— у Сілезіі проці нямецкай меншасьці ніякіх выбарных гвалтаў ані польскі ўрад, ані ўрадавы блёк, ані самі апазыцыйныя партыі не тасавалі.

Заграніцай.

Крытычнае палажэньне работніцкага ўраду ў Англіі.

Работніцкі ўрад Мак-Дональда ў Англіі перажывае цяжкія часы. Ня маючы абсалютнай большасьці ў парляманьце, урад фактычна трымаецца „ласкай" лібэралаў. Бо-ж годзе апошнім хоць раз злучыцца ў галасаваньні проці габінэту з кансэрватарамі, як урад Мак-Дональда паляціць далоў. Такім чынам, каб утрымацца, Мак-Дональду трэба ўсьцяж задагоджваць лібэралаў. Таму работніцкі, сацыялістычны ўрад змушаны весьці буржуазную лібэральную палітыку. Але гэта-ж, з другога боку, страшэнна абурае тую чыста і ярка сацыялістычную частку работніцка-інтэлігенцкай „Партыі Працы", якая здабыла ўладу, асабліва-ж яе крайняе крыло — т. зв. „Незалежных". Былі чуткі і весткі аб тым, што насьпявае вялікі раскол у Партыі Працы з гэтых усіх прычынаў...

У апошні час аднак-жа, ня гледзячы на гэтую ўнутраную „Фронду" (апазыцыю) з боку незалежных, Мак-Дональд, каб за ўсялякую цану ўтрымацца пры ўладзе, пайшоў амаль не цалком пад каманду павадыра лібэралаў, слаўнага Льлёйд-Джорджа. Мак Дональд згадзіўся правесьці новы выбарны закон, якога трэбуе Льлёйд Джордж, бо існуючы закон канчальна забіў бы лібэральную партыю... Пляны Льлёйд-Джорджа ідуць нават аж да стварэньня коаліцыйнага габінэту-работніцка-лібэральнага. Было ўжо быццам паміж лідэрамі абедзьвюх партыяў умоўлена, што на чале новага супольнага ўраду стане Гэндэрсон, адзін з важнейшых партфэляў возьме Льлёйд-Джордж, а Мак-Дональд... паедзе віцэ-каралём у Індыю... Але кансэрватары, баючыся, што Мак-Дональд... сваёй палітыкай страціць Індыю, накруцілі проці гэтай камбінацыі магамэтанскіх дэлегатаў на ўсьцяж працуючай у Лёндане Англійска-Індыйскай канфэрэнцыі, якія быццам заявілі пратэст. Дык віцэ-каралём Індыі мае быць назначаны сучасны англійскі генэрал-губэрнатар Канады (фактычна—пасол Англіі ў незалежнай Канадскай доміні) лёрд Вэлінгтон, сябра лібэральнай партыі.

Такім чынам супрацоўніцтва Мак-Дональда з Льлёйд-Джорджам усьцяж паглыбляецца і зацясьняецца. Гэта аднак-жа не перашкаджае Льлёйд-Джорджу таксама усьцяж паказываць Мак-Дональду сілу лібэралаў.—Так, лідэр лібэралаў заявіў ў парляманьце, што работніцкі ўрад страшэнна скампрамітаваў сябе сваёй бяздзейнасьцю і бяссільлем у справе безработцьця, якую Партыя Працы ў часе выбараў абяцала краю вырашыць грунтоўна і канчальна. Дык ён, Льлёйд-Джордж, мае на пачатку новага году ўнесьці ў парлямант прапазыцыю... недавер'ю да ўраду Мак-Дональда...

Як бачым, лібэралы хочуць паказаць работнікам, што яны больш дбаюць аб іх інтэрэсах, чым іх уласны сацыялістычны ўрад... Усё гэта разам, ведама-ж, робіць палажэньне гэтага ўраду вельмі цяжкім і кампрамітуючым...

Сьвяточная прамова рымскага Папы.

У часе сьвяточнага прыйма кардыналаў папа сказаў вялікую прамову.

У гэтай прамове папа даў агляд важнейшых здарэньняў мінулага году. Пасьля папа з страшэнным абурэньнем сьцьвердзіў в. значныя пасьпехі пратэстанцкага руху ў Італіі, а нават—у самым Рыме, дзівячыся пры гэтым, як гэта ўлады дазваляюць такую „агідна-бясстыдную прапаганду" (пратэстанцкай веры?!), калі „закон гарантуе нятыкальнасьць сьвяшчэннага характару Рыму"... Як відаць, папа пратэстанцкую веру зусім ня лічыць рэлігіяй, а лічыць бязбожніцтвам.

Далей папа заклікаў сусьветных дзяржаўнікаў да ўкрапленьня запраўднага міру, зварачваючы іх увагу на... барацьбу паміж капіталам і працай. Урэшце, громячы „сьляпы нацыяналізм" ды імпэрыялістычную пагоню дзяржаваў за гэгеноніяй (панаваньнем над сьветам), якія няўхільна давядуць да новай сусьветнай вайны, папа—словамі бібліі—зьвярнуўся да Бога, каб Той „зьнішчыў людзей, якія жадаюць вайны"...

У канцы прамовы папа выразіў сваё абурэньне з прычыны таго, што баўгарскі кароль Барыс, які павянчаўся ў Рыме з дачкой італьянскага караля па каталіцкаму абраду, вярнуўшыся ў Баўгарыю „перавянчаўся яшчэ раз па праваслаўнаму...

Рэакцыйная рэвалюцыя ў Турцыі.

У Турцыі выбухнула паўстаньне ў м. Сьмірне. Паўстаньне шпарка ахапіла ўсю Сьмірнскую правінцыю. Пачалі ўлады ўзьмірацъ паўстаньне, і тут раскрылася шырока распаўсюджаная „рэвалюцыйная змова", ахопліваючая ўвесь край... Пачаліся обыскі і арышты — тысячамі. У змове аказаліся замешанымі найвышэйшыя саноўнікі— ваенныя і цывільныя... Рыхтавалася агульна-краёвае паўстаньне, мэўшае мэтай скінуць дыктатуру Кэмаля-Пашы. Турэцкі ўрад абвясьціў, што паўстаньне ў Сьмірне і раскрытая змова маюць яўна рэакцыйны харантар Рух гэты мае намер скасаваць „дэмакратычныя рэформы Кэмаля-пашы дый адбудаваць дарэвалюцыйны лад.

Ф. Акінчыц. Перадрук і пераклад забаронены.

На аграрныя тэмы.

(друкуецца, як дыскусыйны матэрыял).

I.

Значэньня аграрнага пытаньня ў земляробскіх краёх і адносінах да яго сучасных партыяў.

Ня можа быць ніякага сумліву, што ў краёх земляробскага тыпу, як напрыклад Польшча, Румынія, Сав. Саюз і іншыя, зямельнае пытаньне зьяўляецца аснаўным эканамічным пытаньнем, ад правільнага разьвязаньня якога залежыць ня толькі матэр'яльны дабрабыт гэтых краёў, але магчыма і само іх існаваньне.

Гэтае пытаньне зводзіцца ў сутнасьці ня толькі да таго, каб знайсьці спосабы больш мэтаадпаведнага падзелу абмежаванае колькасьці зямлі, якая знаходзіцца ў распараджэньні кожнага гаспадарства, але галоўным чынам, да таго, якім спосабам падняць вытворчасьць зямлі, маючы на ўвазе, што вытворчасьць гэтая павінна расьці роўналежна прыросту насельніцтва.

Досьць цяжкімі акалічнасьцямі для такіх краёў, як напрыклад Польшча, зьяўляецца яшчэ той, цяпер ужо бяссумліўны факт, што з кожным годам усё менш і менш можна разьлічываць на эміграцыю с.-гаспадарчага насельніцтва ў Амэрыку і інш. краі, куды доступ быў яшчэ ня так даўна зусім вольны.

Праўда, калі разабрацца ў сучаснай эканамічнай кан'юнктуры, то заўважым такое зьявішча, як перавытворчасьць хлеба, які напр. амэрыканскія фэрмэры ня ведаюць куды збываць.

Нават Польшча побач з іншым краямі перажывае востры с.-г. крызіс і ня ведае куды збываць свае хлебныя „лішкі" пры бязьмерна ніскай цане на хлеб. У той-жа самы час мы добра ведаем, што ў Польшчы, як і ў іншых краёх, вялікія масы безработных і сялянскага безьзямельнага насельніцтва галадаюць, кормячыся замест хлеба рожнымі сурогатамі. У такім-жа стане знаходзіцца досыць значная частка беларускага сялянства, ня гледзячы на таннасьць хлеба. Такое ненармальнае, з агульнага пункту гледжаньня, зьявішча можна вывесьці толькі на рахунак неправільнай соц.-эканамічнай арганізацыі сучаснага грамадзянства, родзячага цэлы рад парадоксаў.

Усе яны будуць адкінены ў свой час, пасьля радыкальнай пераарганізацыі ўсяго соцыял.-экан. ўкладу сучаснага грамадскага ўстрою на новых падставах. Аднак добра нам ня ведама, калі такая пераарганізацыя наступіць, з другога боку, калі нават прызнаць, што дасканальнай асаблівасьцю будучай соц.-эканамічнай структуры грамадзянства будзе поўная адсутнасьць тых дамаганьняў і парадоксаў, каторыя мы назіраем цяпер, то з гэтага зусім ня вынікае, каб мы сядзелі злажыўшы рукі і цярпліва чакалі нейкіх новых „райскіх" умоваў жыцьця, якія павінны наступіць няведама калі. Нам трэба ўжо цяпер вызначыць які тып гаспадаркі зьяўляецца найбольш вытворчым і якімі спосабамі цяпер-жа, пры існуючых умовах магчыма падняць вытворчасьць зямлі і працы ў сельскай гаспадарцы і арганізаваць яе на больш разумных падставах. Вызначыўшы гэта — мы паступова павінны ісьці да мэты, ужываючы адпаведныя эканамічныя мера прыемствы.

Дасягнуўшы пэўных пасьпехаў у гэтым кірунку, мы тым самым палепшым ня толькі сваё ўласнае істнаваньне, але аблегчым і працу будучых пакаленьняў, каторым бяссумліву прыдзецца падыйсьці зусім блізка да радыкальнай рэканструкцыі ўсяе сельскае гаспадаркі на больш рацыянальных падставах, чым яны цяпер існуюць. Для нас павінна быць зусім яснай тая акалічнасьць, што сучасны тып нашае малапрадуктыўнае і першабытнае сялянскае гаспадаркі не павінен застыць у сваіх формах і абавязкава павінен перарадзіцца ў новую, больш прадуктыўную форму, збудаваную на навуковых падставах.

Тое, што мы цяпер назіраем у галіне сельскае гаспадаркі, дзе дробныя, карлаватыя надзелы зьяўляюцца пануючай формай, — нічым іншым як соц.-эканамічнай убогасьцю—назваць немагчыма.

І вось якраз заданьнем нашага пакаленьня зьяўляецца бліжэй падыйсьці да гэтай „убогасьці", разглядзець яе і знайсьці такую эканамічную праграму, якая-б паднясла яе на пэўную вышыню, на якой ёй трэба стаяць. Ня прыходзіцца нават застанаўлівацца над тым, якое значэньне мае ў сучасны момант тое ці іншае палажэньне сялянскае гаспадаркі дзеля гарадзкой прамысловасьці.

Усім цяпер павінна быць зразумелай тая эканамічная сувязь, якая існуе паміж горадам і вёскай, быўшай заўсёды галоўным рынкам збыту тавараў гарадзкой прамысловасьці. Разважаньні на гэту тэму мы лічым лішнімі дзеля таго, што гэтае пытаньне сталася зусім ясным усякаму хоць крыху граматнаму чалавеку.

Няма цяпер ніводнае групы насельніцтва, ніводнае клясы, каторыя не мелі-б сваёй праграмы дзеяньняў па гэтым аснаўным пытаньні сучаснай экономікі. Усе такога роду праграмы—можна аднак зьвесьці да некалькі тыпічных або аснаў

Канец дыктатуры ў Гішпаніі?

Дыктатура, як і насьледнае самздзяржаўе, заўсёды „позьніцца на 5 мінутаў“... Так сама і ў Гішпаніі: калі народ патрэбаваў ужо рэспублікі, тады каралеўскі ўрад ген. Бэрэнгуэра мае „вярнуць краю нармальны канстытуцыйны лад“... Урад абвясьціў, што выбары ў парлямант адбудуцца 1 сакавіка — згодна з гішпанскай канстытуцыяй, якая прадбачыць цэлы месяц поўнай свабоды прадвыбарнай кампаніі... Але, калі ў ген. Бэрэнгуэра запыталіся, калі ж будуць ужо скасаваны ваеннае палажэньне, ваенная цэнзура і падобныя кветачкі дыктатарскага ладу, „адбудоўца“ гішпанскай канстытуцыі адказаў, што „выняткоўыя меры будуць захаваны датуль, пакуль будуць бязумоўна патрэбныя“... Дык — якая мае быць „свабода выбараў“, які мае быць „паварот да нармальнага ладу“ ў генаральскай Гішпаніі, мы можам добра прадбачыць...

А тым часам манархія ў Гішпаніі ўсьцяж трашчыць—ледзь трымаецца...

З Савецкага жыцьця.

Зноў „рашучы ўдар“ па сялянству.

Справы, зьвязаныя з харчаваньнем мястовае беднаты, аб якой толькі і рупіцца савецкая ўлада, стаяць вельмі дрэнна. Газэта „Правда“ б'ець з гэтае прычыны трывогу.

З гэтае газэты мы даведваемся, што ў лістападзе м. г. адпаведныя ўлады павінны былі прыслаць 48.876 тонаў мясных прадуктаў у прамысловыя цэнтры з раёнаў, загатаўляючых скаціну. Але за 25 дзён лістапада — сумуе газэта — выслана было толькі 16.458 тон. Лістападавы плян „адгрузак“ гэтакім чынам выкананы быў толькі на 33,7%.

„...Прамысловыя цэнтры, — піша „Правда“ — „штомесячна недаатрымоўваюць тысячы тонаў мясных прадуктаў. Віноўнікі гэтага павінны быць безадкладна пацягнены да адказнасьці.. Што-б там ня было, а плян адгрузак павінен быць выкананы“. „Масква, дзякуючы гэтаму, атрымоўвае толькі 34,6%, Ленінград—гэтулькі-ж, а рэшта цэнтраў—толькі 25,7% таго, што прадбачылася“. („Правда“ 7 сьнежня № 335).

Так стаяць справы з мяснымі прадуктамі; яшчэ ў горшым стане аказалася справа з загатоўкамі бульбы і рознага варыва. Лістападавы плян, як відаць з тэй-жа камуністычнай газэты, выкананы толькі 24,9%. Гэта значыць, што горад сядзіць ня толькі бяз мяса, але і бяз бульбы. „Ува ўсім гэтым“ — пацяшаець сваіх галодных чытачоў „Правда“ — „вінаваты кулакі і правыя ўхільнікі.

Да гэтага ўсяго трэба яшчэ дадаць, што і загатоўкі хлеба ідуць ня зусім так, як бы таго хацелася савецкай уладзе. Напрыклад, у Казакстане (Доншчына) плян загатовак выкананы толькі на 64%, а г. зв. кулакі (асноўная маса сялянства ў гэтым раёне) далі толькі ¼ частку таго, што было прадбачана па пляну. Прыблізна такі самы стан рэчаў і ў іншых хлебных раёнах Савецкага Саюзу. Падсумаваўшы ўсе гэта, „Правда“ з абурэньнем прыходзіць да такога вываду: трэба „зрабіць рашучы ўдар па кулаку — заможнаму вяршку сяла!“

Шмат ужо гэтых „ўдараў“ перацярпела сялянства за часы панаваньня Компартыі, але хлеба, як відаць, ад гэтага ўсяго зусім не прыбывае...

Сталінскія „двадцаціпяцітысячнікі“.

У свой час па загаду Сталіна для „ліквідацыі кулацтва, як клясы“ і правядзеньня калектывізацыі вёскі — на правінцыю было кінена з фабрык і заводаў 25 тысяч работнікаў камуністаў.

Як наракалі потым нават самыя савецкія газэты, сталінскія баявікі, зусім ня ведаючы, як прыступіць да гэтай самай калектывізацыі, пачалі лавіць па вёсках курэй і парасят,— і з гэтага пачалася „сацыялістычная рэканструкцыя“.

Прайшло шмат часу і аб гэтых „25-тысячніках“ савецкая „грамадзкасьць“ пачала забывацца. І толькі цяпер улада прыпомніла, што некалісь былі кінены на вёску „тысячнікі“, якія павінны былі нешта зрабіць, але што яны фактычна зрабілі — аб гэтым ня ведаець сам Сталін. Дык адносна гэтых курына-парасячых калектывізатараў выйшаў такі загад:

„Тыя двадцаціпяцітысячнікі, якія выявілі поўную нездатнасьць да працы на вёсцы, павінны быць безадкладна адпраўлены назад на фабрыкі“ („Известия“ 5 XII. 1930 г. № 334)...

Новая перасадка ў найвышэйшым „квартэце“ СССР.

Пасьля зьмены асабістага складу Рады Нар. Каміс., з якой выкінулі Рыкава, пасадзіўшы на яе чале бліжэйшага прыяцеля Сталіна—Молатава, адбыліся перамены і ў Радзе Працы і Абароны. Вялікую сэнсацыю зрабіў уваход у склад гэтай Рады самога Сталіна, як звычайнага сябры. На чало яе пастаўлены той-жа Молатаў. Сталін упяршыню злучае працу у компартыі з становішчам у урадавым апараце радавай дзяржавы.

Побач з перабудовай гэтых дзьвюх найвышэйшых выканаўчых установаў — створана яшчэ і новая, гэта—так званая „камісія выкананьня“ пры Радзе Нар. Камісараў. Усе гэтыя цэнтральныя ўстановы зарыхтаваны спэцыяльна і асабліва дзеля поўнага, точнага і своечаснага выкананьня сталёнага „пяцілетняга пляну“ („пяцілеткі“). Дзеля таго Камісія выкананьня атрымала велізарныя (?) паўнамоцтвы для „барацьбы з бюракратызмам“ і „ўмацаваньня дысцыпліны“ ува ўсіх дзяржаўных і гаспадарчых установах краю.

Можа што з гэтай „барацьбы“ бюракратычнага цэнтралізму з бюракратызмам на мясцох і выйдзе. Цікаўна толькі, якія-ж яшчэ новыя „паўнамоцтвы“ маглі выдумаць бальшавікі для сваіх бюракратычных самадзержцаў, каб змусіць... дзяржаўную і гаспадарчую „прыроду“ да „слуханьня і выкананьня“ іх загадаў і дэкрэтаў?! Здавалася-б, колькі ні расстрэлівай найразумнейшых, найбольш азброеных навукова і тэхнічна „спэцаў“, гэтым не застрашыш гэтай дзеючай па сваіх законах „прыроды“, ня змусіш яе слухаць недарэчныя загады камуністычнай „верхавіны“. Хіба толькі адно астаецца: для адказнай працы ўжываць менш разумных і асьвечаных, а больш дурных, сьляпых і цёмных, хаця і з „велізарнымі паўнамоцтвамі“ ад ЦІК-а...

З Савецкае Беларусі.

Адгукнуліся.

У №№ 290 і 291 „Зьвезды“ з дня 13 і 14-га сьнежня 1930 г. зьмешчаны інтэрвью Рак-Міхайлоўскага, Мятлы, Бурсэвіча і Грэцкага, дзе яны, выхвальваючы жыцьцё ў БССР, прадстаўляюць жыцьцё пад Польшчай у самым чорным сьвятле. Адначасна, зразумела-ж, нападаюць на арыштаваных у Менску сваіх таварышоў, дамагаючыся для іх самае жорсткае кары.

Вось, дык, дакаціліся... пакуль што да Менску, а праз нейкі час самі, бязумоўна, сядуць у лёхі Г. П. У., каб адтуль пакаціцца далей..., ажно да Саловак!

Янка Купала і Усевалад Ігнатоўскі „каюцца“.

Да якой ступені ў апошнія часы завастрыўся маскоўскі тэррор у Савецкай Беларусі відаць з „пакаянных“ Янкі Купалы і Усев. Ігнатоўскага — б. Старшыні (цяпер скіненага) Беларускае Акадэміі Навук, дзе адначасна з самым агідным і паніжаючым сябе пакаяньнем дамагаюцца кары сьмерці для сваіх арыштаваных таварышоў, прыракаючы і клянучыся надалей верна служыць Компартыі. Ну і „рай“ жа ўтварыўся цяпер у Саветах!

„Довады“ контррэволюцыйнай дзеяльнасьці беларускіх культурнікаў у Менску.

Старшыня Ціка Беларусі Галадзед на нядаўна адбытым пленуме Цік'а, як довад контррэволюцыйнай дзеяльнасьці арыштаваных у Менску беларускіх культурнікаў, прадставіў наступнае:

„У слоўніку Некрашэвіча слова „эксплёатацыя“ перакладзена на беларускую мову—„вызыск“ а слова „пролетарыят“ператлумачана—„бядота“, Ува ўсіх-жа школьных падручніках Лёсіка нідзе не спатыкаецца слова „рэволюція“.

З далейшага дакладу Галадзеда вынікае, што арыштаваныя, падгатаўляючы ўтварэньне Беларускай Народнай Рэспублікі пад пратэктаратам Польшчы (?), ужо на'т падзялілі міністэрскія портфэлі. Сярод кандыдатаў на будучых беларускіх міністраў Галадзед называе наступныя прозьвішчы: Ластоўскі, Смоліч, Некрашэвіч, Лёсік і на'т Луцкевіч, а на ваеннага міністра Галадзед вызначыў ажно... генэрала Булак-Балаховіча!

Ну й прыдумалі! Аддавай хоць у „Маланку“..

Кароткія навіны.

Ведамы польскі публіцыст,—эндэк п. Новачыньскі, пасьля аб'езду Эўропы, напісаў артыкул, у якім кажа, што на Эўропу з страшэннай шпаркасьцю набліжаецца новая вайна, якая будзе для Эўропы ўжо канчальным самагубствам. Новачынскі заклікае ўсе польскія партыі да згоды, бо-ж „для ненавісьці ўзаемнай ужо часу нямаш“.

Нямеччына адмовілася прадоўжыць надалей умову з Польшчай у справе ўвозу да яе польскага лесу, якой тэрмін скончыўся з канцом мінулага году.

Трэба думаць, што прычыны гэтай адмовы— ня толькі эканамічныя (Нямеччына мае аж зашмат танейшага і лепшага — „дэмпінговага“ — радавага лесу), але і „палітычныя“; адносіны паміж Нямеччынай і Польшчай наагул іззноў завастраюцца ўсе больш.

У апошнія дні паміж СССР і Польшчай неяк завастрыліся адносіны. У сваім часе радавы ўрад выдаў загад, абмяжоўваючы гаргова-прамысловыя правы польскіх грамадзян у СССР, зрабіўшы рожныя дазволы і канцэсіі для іх залежнымі ад цэнтральных уладаў, а не ад мясцовых, як было дагэтуль.

Тое-ж самае, у парадку ўзаемнасьці, зрабіў— адносна да радавых грамадзян у Польшчы — і польскі ўрад.

Бэльгійская сацыялістычная прэса даведалася, быццам паміж Францыяй і Бэльгіяй надпісаны новы ваенны дагавор, які, ведама-ж, не зарэгістраваны ў Лізе Нацыяў, як гэтага трэбуе яе статут.

У Францыі—выклікае неспакой, нямецкі праект аб'еднаньня амаль ня ўсей Сярэдняй Эўропы ў мытным саюзе, выключаючым здаецца, толькі адну Польшчу. Да гэтага „Цольфэрэйну“ мелі б далучыцца нават Югаславія, Баўгарыя і Румынія. Нямеччына дае ўсім гэтым дзяржавам значныя палёгкі ў галіне збыту і транзыту сельска-гаспадарчых прадуктаў — узамен за рад прывілеяў для нямецкага экспорту фабрыкатаў. Коратка кажучы на прасторы гэтых дзяржаваў ідзе страшэнная барацьба паміж Нямеччынай і Францыяй— за прывілей прамысловага вызыску гэтых аграрных дзяржаваў.

Француская прэса востра ляець ваеннага міністра. які... закупіў велізарную партыю радавых макаронаў для арміі, ня гледзячы на афіцыяльна абвешчаны ў Францыі байкот радавага „падрыўнога экспорту“ („дэмпінгу“), а папярэдні ваенны міністар наагул забараніў купляць прадукты для арміі заграніцай. Устаяць перад спакусай таннага, хаця й бальшавіцкага тавару, як відаць, вельмі цяжка нават для багатай дый процібальшавіцкай Францыі, а думку аб тым, што гэтыя радавыя макароны адабраны савецкім урадам ад галоднага насяленьня СССР, якраз лягчэй адагнаць ад сумленьне... наеўшыся гэтых танных макаронаў...

Памёр Маршал Жофр, адзін з выдатнейшых Францускіх галоўных камандзіраў у вялікай вайне.

Ня гледзючы на „працу“ засядаючай у Лёндане „англійска - індускай канстытуцыйнай канфэрэнцыі“, ў Індыі ня спыняецца, але ўсьцяж завастраецца народны рэвалюцыйна-вызваленчы

ных групаў, каторыя ў сутнасьці ніякага разьвязньня аграрнага пытаньня не даюць.

Перадусім трэба застанавіцца на праграмах т. зв. буржуазных партыяў, якія імкнуцца адстаяць асноўныя соц.-эканамічныя падставы сучаснага грамадзянства ў незакранутым відзе. Характэрна для іх зьяўляецца тая асаблівасьць, што яны зусім пазбаўлены гістарычнай пэрспэктывы і зусім ня цікавяцца тым, у якім напрамку ідзе разьвіцьцё грамадзянства і якое будзе палажэньне ў галіне аграрных адносінаў у бліжэйшай нават будучыні.

Уся іх увага зьвернена на тое, каб за ўсялякую цану ўтрымаць і падтрымоўваць сярэднюю і буйную зямельную ўласнасьць, забясьпечыць гэту ўласнасьць таннай рабочай сілай, знайсьці выгадныя рынкі збыту сельска-гаспадарчых прадуктаў і т. п.

Тая акалічнасьць, што сялянская гаспадарка падупадае, што сялянскія надзелы драбнеюць, прыймаючы карлаватыя, зусім нявыразныя і нягодныя для сельска-гаспадарчай прадукцыі памеры, што колькасьць безьзямельных прагрэсыўна павялічываецца і што яны выміраюць ад хранічнага недаеданьня,—іх зусім ня цікавіць, ці лепш кажучы, перад усімі гэтымі пытаньнямі, яны палахліва, як страўсы — хаваюць галаву, не даючы ніякага на іх адказу.

Часам прыходзіцца спатыкацца з „пабожнымі“ развajжаньнямі мальтузіянскага характару, дзе прычыны ўсяго зла яны стараюцца зваліць на грэшную натуру чакавека, каторы ня можа ўстрымацца ад такога грэху, як размнажэньне чалавечага роду.

Ня трэба нам застанаўлівацца на падобнай мальтузіянскай брахні на чалавечы род. Мы лічым, што ўсё, што здараецца ў прыродзе, а ў тым ліку і ня спыняючаяся размнажэньне чалавечага роду, мае свае моцныя, прыродныя падставы, каторыя яшчэ так мала разгаданы людзкасьцю і ў сваей большасьці зьяўляюцца для нас тайнай.

Справа заключаецца ня ў тым, што на сьвет родзяцца непатрэбныя людзі, а ў тым, што наша грамадзянства так дрэнна арганізавана, што застаўляе паміраць галоднай сьмерцю аграмадныя масы людзей.

Далей мальтузіянскіх „мараляў“ і фіёлзофіі вайны, ня можа пашырацца кругазор сучасных мысьліцеляў і мы таму не знаходзім у навуковай літэратуры ніводнае працы, якая-бы аб'ектыўна, з пункту гледжаньня інтарэсаў усяго чалавецтва ў цэласьці, зацікавілася-бы вырашэньнем аграрнага пытаньня і дала-бы нам хоць прыблізна схэму дзеяньняў на некалькі дзесяткаў год у перад.

У такім-жа палажэньні знаходзіцца і кіраўніцтвы сучасных гаспадарстваў, якія ня маюць ніякіх гістарычных пэрспэктываў і ўся дзеяльнасьць каторых зводзіцца да бягучай штодзеннай працы.

Калі ўзяць такія краі, дзе ў свой час прайшла аграрная рэвалюцыя, як напр. Латвія, Румынія і т. д., то там урады прыводзяць у пэўны парадак толькі тое, што стыхійна прарабіла сама рэвалюцыя—гэта ў найлепшым выпадку, а ў горшым — імкнуцца ўсімі сіламі ўрэзаць заваяваньні рэвалюцыі на карысьць „пацярпеўшых“ землеўласьнікаў.

У гэтым, галоўным чынам, і заключаецца праца ўсіх сучасных урадаў.

(Далей будзе).

рух. Зацягваньне Англіяй абяцанай „дамініяльнай“ (самастойнай) канстытуцыі ўсьцяж ператварае „пасыўны байкот“ гандыстаў у актыўную, часта густа нават тэрарыстычную барацьбу рэвалюцыйных незалежнікаў. Шматлічныя замахі апошніх дзён змусілі віцэ-караля ізноў аджывіць старыя, скасаваныя ўжо „выняткавыя законы“, ці ярасьцей—увясьці ваеннае палажэньне з жорсткай цэнзурай, цяжкімі карамі за легальную звычайна-законную барацьбу проці ўраду, за гандлёвы байкот і т. д. Але ўсе гэтыя меры б'юць больш па мірных гандыстах, а рэвалюцыянеры іх не баяцца. Таму, зараз-жа пасьля ўвядзеньня ваеннага палажэньня, зроблены страшэнны бомбавы замах у сталіцы Індыі—Дэлі.

У англійскай калёніі Бірма (на паўвостраве Індокітаі) ня спыняецца рэвалюцыйна-незалежніцкі рух. Перад сьвятам паміж атрадамі паўстанцаў і англійскай паліцыяй адбыліся запраўдныя баі, у якіх, ведама-ж, гіне значна больш мясцовых жыхароў, ад лепшага англійскага азбраеньня.

У францускім Марокко якраз сьвятам выбухнула паўстаньне аднаго з „прыхільных да Францыі“ плямёнаў. Дык у дзень Божых Народзінаў францускія аэрапляны засыпалі кулямётным агнём ды „бомбаньеркамі“ сялібы паўстанцаў, пакуль не падыйшла кавалерыя ды артылерыя, „спыніўшыя паўстаньне“.

Запраўдныя „каляніяльныя калядкі“ нашых часоў: і „сьв. Мікалай“ і „неспадзяванкі“ з бомбаньеркамі (па францускі гэта — карабок з цукеркамі) для дзетак няўдзячных каляровых грамадзян у калёніях.

У сталіцы Вэнэцуэлі, Каракасе (паўднёвая Амэрыка), таўпа, на чале з рэвалюцыянерамі, кінулася да вастрогу, каб звольніць палітычных вязьняў. Але паліцыйны атрад даў некалькі залпаў у таўпу ды забіў каля 2 дзясяткаў чалавек, у тым ліку — матак вязьняў...

У сталіцы Бразыліі ўсьцяж адбываюцца сутычкі паміж студэнтамі і паліцыяй. Як ведама, у Бразыліі нядаўна выбухнула і здабыла перамогу вялікае паўстаньне, бяднейшых ды вызыскаваных станаў проці багацейшых. У выніку перамогі павадыры абодвух лягераў апрацавалі новы лад — больш справядлівы, але, ведама-ж, не здаволіўшы крайніх рэвалюцыйных павадыроў пакрыўджаных станаў. Хваляваньні сярод студэнскай работніцкай моладзі і ёсьць, так сказаць, „рэвалюцыйная атава“ — перад новым „сенакосам“...

Хроніка.

— **У Цэнтрасаюзе.** У сэкрытарыяце Цэнтрасаюзу (Вільня, Вострабрамская 9) распачата прыймо заяваў з вёсак і мястэчак аб жаданьні іх мець лектароў, дзеля чытаньня ў іх лекцыяў. Напамінаем, што мясцовыя сілы мусяць узяць на сябе выкаход памяшчэньня і арганізацыю збыту білетаў,—тады Цэнтрасаюз у ўмоўленым часе вышле лектараў. Сьпяшыце, грамадзяне, з заявамі, каб пры разьмяркоўваньні месц для лекцыяў вас не абмінулі!

— **Аздараўленьне Беларускай Дзяржаўнай вуч. сэмінарыі імя Фр. Багушэвіча.** Даведываемся, што новы Куратар Віл. Шк. вокругу пан Шэлёнгоўскі прыехаўшы ў Вільню зараз-жа зьвярнуў увагу на тое ненармальнае палажэньне, у якім апынулася Белар. вуч. сэмінарыя. 13 га сьнежня мінулага году новы Куратар запрасіў да сябе былога Дыр. сэмінарыі гр. Р. Астроўскага. Пасьля 2-х гадзінавае конфэрэнцыі з гр. Астроўскім, азнаёміўшыся ўсебакова з гэтаю справаю, пан Куратар згадзіўся здаволіць тыя слушныя дамаганьні белар. грамадзянства, якія ляжаць у компэтэнцыі Кураторыюму, асабліва-ж у галіне выхаваньня і асабістага складу пэдагагічнага пэрсаналу, і запрапанаваўшы адначасна гр. Астроўскаму з 1 студня г. г. ізноў прыняць на сябе выконваньне абавязкаў дырэктара сэмінарыі.

У пытаньнях, канчальнае вырашэньне катарых залежыць ад вышэйшых уладаў, знойдзены кампрамісны выхад, які дасьць магчымасьць нармальнае працы ў школе.

Дзякуючы такому вырашэньню гэтае балючае для нашага грамадзянства справы, рэдакцыя ня лічыць магчымым у сучасны мамэнт апублікаваць прысланы нам зацікаўленымі асобамі матар'ял у справе жаноцкага інтэрнату сэмінарыі. Нам зразумела ня ходзіць аб паглыбленьні антаганізмаў, а выключна аб паралізаваньні шкоднай дзеяльнасьці злосных ці проста ненармальных адзінак, а прысутнасьць у сэмінарыі на кіраўнічым становішчы гр. Астроўскага дае нам пэўнасьць, што тыя агідныя рэчы, аб якіх нас паведамляюць бацькі дзяўчат з жаноцкага інтэрнату, больш не паўторацца.

— **Шосты гадавы зьезд „АБСА“ ў Празе Чэскай.** 29 і 30 сьнежня 1930 году адбыўся ў Празе Чэскай шосты гадавы зьезд Цэнтралі Беларускага Студэнства —„Аб'яднаньня Беларускіх Студэнскіх Арганізацыяў“, знанага пад скаротам „АБСА“. На гэты зьезд былі выдэлегаваны і прадстаўнікі Беларускага Студэнскага Саюзу ў Вільні, але з прычыны браку матэрыяльных сродкаў мог ўся на гэты зьезд выехаць толькі адзін прадстаўнік — гр. Ст. Станкевіч, які адначасна зьяўляецца сябрам Ураду „АБСА“. Аднак, нажаль, і гэты адзін прадстаўнік ня мог выехаць у Прагу—з прычыны неатрыманьня на час заграмічнага пашпарту. Гр. Ст. Станкевіч яшчэ загадзя, бо 28 лістапада м. г. падаў у Міністэрства Скарбу заяву з просьбаю аб выдачы зьніжковага заграмічнага пашпарту. Тамака абяцалі адказ пераслаць у Віленскае Ваяводзтва не пазьней, як за тры тыдні. Аднак, як на дзіва, адказ гэты прышоў (праўда пазытыўны) аж 2 студзеня с. г., значыцца праз тры дні пасьля зьезду...

Адным словам нішто іншае, як вельмі ветлівая адмова.

У гэтай справе „АБСА“ мае падаць скаргу да „Міжнароднае Студэнскае Конфэдэрацыі“ (С. Ү. Е.), якой зьяўляецца сябрам.

— **Чарговая зборка Беларускага Навуковага Т-ва.** У нядзелю, 18-га студзеня, у 4 гадз. дня ў памяшчэньні Беларускага Музэю (Вострабрамская 9) адбудзецца чарговая зборка сяброў Белар. Навуковага Т-ва. На парадку дня — справа наладжаньня краязнаўчае працы. Даклад прачытае сэкрэтар Т-ва д-р М. Ільляшэвіч.

Госьці па рэкамэндацыі сяброў Т-ва.

Пажадана, каб справай краязнаўчае працы зацікавілася наша студэнцкая моладзь.

Зачараванае кола.

Вы ўжо ведаеце, браты, што піша гэтыя словы Ідэ. Ідэ, які часта „чыркаў“ фэльетон-чыкі ў беларускіх газэтах і які часта крые ў сабе вялікую, зьядлівую ненавісьць да сучасных варункаў жыцьця.

Выабразіце сабе: Кнігарня. За шклом — кнігі. Новыя! добрыя кнігі! І зразумейце, што я хачу чытаць! (падкрэсьліваю:) хачу чыта...аць! І—не магу... бо няма грошы, бо я—ня сын міністра, бо я ўрэшце ня еўшы часта хаджу. А цяпер у дадатак холадна.

І вось—тады я сумны, разьбіты, пануры, сярдзіты. Я прыходжу ў свой пакой-(чык) і стараюся разьвесяліцца. (Я ўсё-ж оптыміст, гэта значыць, што я хачу жыць і есьці!).

Як разьвесяліцца?

Я скачу на аднэй назе і сьпяваю:

Фэльетон—чыкі—чыкі,
Фэльетон—чыкі—чыкі...

Я раблюся вясёлым і веру, што ўсё-ж прыемна жыць і прыемна адчуваць, што я, напрыклад, Ідэ, а ня нейкі конь або жаба. Ад скаканьня на аднэй назе мне нават цёпла. І цёпла ў сэрцы. Калі-небудзь, я зайду ў хату на вёсцы (бо, ведайце, я пайду шукаць жыцьця, яно недзе павінна быць, і то павінна быць у нас, на Беларусі!), гаспадар хаты абыйме мяне й сардэчна скажа:

О, гэта ты, Ідэ! Я чытаў твае фэльетоны! Я часта сьмяяўся і часта плакаў, Ідэ, чытаючы твае словы! Сядай, брат Ідэ! Ты ў мяне найдаражэйшы госьць.

Але гэта — справа будучыні. Аднак, я мусіў аб гэтым сказаць, браты, бо вы-ж мяне яшчэ мала ведаеце. Я пэўны, што Сьцяпан Завала з вёскі Сьпячка нават і ня чуў аб маіх фэльетонах. А ён мусіць іх прачытаць, бо я да яго ў першую чаргу й зайду ў госьці.

„З недахопу мейсца“, як у нас звыклі казаць, не магу больш пісаць аб сабе. Шмат у мяне пляноў і думак! Вось, напрыклад, я часта думаю, што кожны мог-бы есьці белы хлеб і т. д. Думкі свае раскажу калі-небудзь, калі наша прэса не памрэ на сухоты. (Пагода цяпер к-хэ епская!). А сягоньня буду пісаць аб „зачараваным коле“.

Што гэта за зьвер — вы зараз даведаецеся. А покі-што малое выясьненьне.

Ты, дарагі чытач, можа й не папытаешся, а другі возьме ды спытае:—чаму-ж Ідэ наш дарагі піша аб нейкім „зачараваным коле“, а не аб выбарах? Скажу вам, браты, шчырую праўду. Я ўсё яшчэ думаю наконта гэтых выбараў. Рэч тут не абы-якая! Я мушу прачытаць перадусім усе газэты (у мяне іх поўны пакой (чык). А апроч гэтага, трэба ведаць, што еў у дзень выбараў той ці іншы кандыдат на пасла і як ён спаў уначы перад выбарамі. Я ўсё думаю й вучуся выбараў. Тут нейкая штука павінна быць! Напэўна павінна быць! Схудаў я страшэнна ад думак — скура ды косьці засталіся.

А цяпер аб страшным зьвяру — „зачараваным коле“.

Круціцца гэтае кола, круціцца і яшчэ раз круціцца. І мы ў гэтым круцімся ды яшчэ раз круцімся. А кола гэтае — нашая сучаснасьць. І думаем мы, як мухі, і здаецца нам плыткія думкі — вялікімі. І здаецца нічога й няма паза гэтым колам. А гляньце, брацьця, колькі сонца навокал, радасьць, як птушкі, чырыкае. Выхадзі, маладая рась! Будуй новае жыцьцё, твары сваю долю!

Тут, браткі, выбачце, але я не магу ня быць паэтам і мушу крыкнуць, захапіцца, каб мой запал пераліўся ў вас.

Але вось гэтае праклятае „зачараванае кола“?

Вось, напрыклад, ці гэта не „зачараванае кола“?

Адзін беларускі інтэлігэнт зьяўляецца сябрам дзесяцёх беларускіх арганізацыяў: у аднэй — старшынёй, у другой — скарбнікам, у трэцьцяй—сэкрэтаром, у чацьвертай — ізноў старшынёй і пачынай спачатку. А рэшта нашага „грамадзянства“ — вось так сабе. І справа — шыш! Трэба ўсім, усім брацца, каб справа нашая пішчэла. А то мы пішчым, а аб справе толькі гаворым. У нас так: калі адзін крычыць — усе слухаюць. А перастане ён крычаць — сьпяць, і калом іх не падважыш. Ну — і „круці Гаўрыла“ і „Ад веку мы спалі“...

Няма ў нас людзей з гарачым сэрцам, з здаровымі душамі й думкамі, якія клалі-б на аўтар нашых ідэалаў свой запал. Усё „зачараванае кола“ або — „круці Гаўрыла“.

Ідэ кідае словы-зярняты аб шчырым чалавеку на Беларусі. Сьцяпан Завала з вёскі Сьпячка, прачытаўшы гэтыя словы, напэўна скажа:

— Праўда! Што за жыцьцё маё было? Я толькі працаваў усё жыцьцё — і што я маю з гэтага? Хлеба не хапае, п'ю я з бяды дый ня бачу нічога добрага.

І возьме — і прышле падпіску на газэту.

А я пад сакрэтам вам скажу, што ўжо расьце гэты шчыры, новы чалавек на Беларусі. Ен спаў вечным сном і цяпер будзіцца да жыцьця. Бо як яму не нарадзіцца, калі мы — народ такі самародны?! Мы маем сваю Лявоніху, сваю зацірку, свае цымбалы, сваю сярмагу...

А покі-што — „зачараванае кола“ круціцца, як шарманка і падпявае:

Ціра-ля ля ціра-ля-ля
Ах, чаму мы бедны,
Ад таго, што цёмны,
А чаму мы цёмны,
Ад таго, што бедны,
А, чаму мы бедны,
Ад таго, што цёмны і так далей.

Ідэ.

Рэдактар-выдавец: **М. Сіняўскі**

Друкарня Я. ЛЕВІНА Вільня, Нямецкая 22.